# КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПЕРШАГА ЗВОДА ЗАКОНАЎ БЕЛАРУСІ

*Т.І.Доўнар*

29 верасня 1529 года быў уведзены ў дзеянне знакаміты звод законаў ВКЛ – буйной сярэдневечнай дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі. Шматлікія навукоўцы падкрэслівалі яго важнасць і дасканаласць, адзначаючы пры гэтым, што напісаны ён быў на старажытнай беларускай мове, “прочно утвердившейся к тому времени в качестве языка великокняжеской канцелярии”[1].

У практычных мэтах арыгінальны тэкст Статута часта перапісваўся. Захаваліся некалькі яго спісаў, чатыры з якіх (Фірлейскі, Замойскіх, Дзялыньскі і Слуцкі) былі напісаны на мове арыгінала (г.зн. старажытнай беларускай мове[2]), тры перакладных (Лаўрэнцьеўскі, Пулаўскі – на лацінскай мове, Альшеўскі – на польскай). Два спісы на польскай мове былі знішчаны пад час апошняй вайны. Тэкст спісаў некалькі адрозніваўся, у сувязі з чым перад шматлікімі даследчыкамі заўседы стаяла адна з галоўных задач – узнавіть найбольш блізкі да юрыдычнага арыгінала (аутэнтычны) тэкст Статута. Перыядычна па тых ці іншых прычынах цікавасць да гэтага важнага закона павялічвалася. Так, у 20-я гады мінулага стагоддзя ў сувязі з 400-годдзем прыняцця Статута навукоўцы розных краін узнавілі пошукі яго спісаў і даследаванні. Аднак апублікавана было няшмат работ, у асноўным у Польшчы.

Амаль 50 гадоў таму значнай навуковай падзеяй у Беларусі стала выданне тэкста Статута, падрыхтаванае да друку Аддзелам прававых навук АН БССР пад рэд. К.Яблонскіса [3]. Вучоныя адзначылі большую дакладнасць яго тэкста ў сувязі з тым, што ў аснову выдання быў пакладзены Дзялыньскі спіс з прыцягненнем новага адчыненага спіса Замойскіх. Аднак даследчыкі Літоўскай ССР звярнулі ўвагу на шэраг недахопаў гэтага выдання

і ў 80-я гады ажыццявілі ўласнае, вельмі шыкоўнае выданне Статута. Патрэбна адзначыць, што імі была праведзена вельмі вялікая праца па удакладненню тэкста Статута, былі надрукаваны ўдакладненні і пэўныя каментарыі да яго, што садзейнічала далейшым навуковым даследаванням.

У Беларусі таксама надавалася ўвага Статуту. Асабліва актывізаваліся даследаванні ў сувязі са значнымі грамадска-палітычнымі зменамі ў 90-я гады XX ст. Прафесар Я.А.Юхо ў сваіх працах неаднойчы падкрэсліваў асаблівую значнасць гэтага першага звода законаў ВКЛ, у аснову якога было пакладзена галоўным чынам звычаёвае права старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў (Полацкага, Віцебскага, Турава-Пінскага, Навагрудскага і інш.). Ён аргументавана даказваў удзел у падрыхтоўцы Статута знакамітага беларускага вучонага Францыска Скарыны, што ў першую чаргу выцякала з супастаўляльнага аналізу яго твораў і зместа Статута [4]. У сваю чаргу літоўскія вучоныя падкрэслівалі, што галоўным кадыфікатарам і кіраўнікoм падрыхтоўкі тэкста Статута быў адукаваны для свайго часу буйны магнат, канцлер дзяржавы Альбертас Гоштаутас (Альбергт Гаштольд). Аднак, дакладна члены статутнай камісіі невядомы. Несумненна, галоўнымі ініцыятарамі і распрацоўшчыкамі яго былі феадалы, на карысць якіх і прымаўся гэты закон. Улічваючы, што вышэйшым, у тым ліку і заканадаўчым, органам дзяржавы была рада, то паны-рада з Вялікім князем і былі галоўнымі распрацоўшчыкамі Статута. Патрэбна адзначыць, што прагрэсіўныя прававыя ідэі тагачасных беларускіх мысліцеляў у той ці іншай ступені знайшлі ў ім адлюстраванне, хаця бы ў дэкларатыўным выглядзе, у замацаванні ідэяў-прынцыпаў. Першы сістэматызаваны закон дзяржавы быў выклікан да жыцця шматлікімі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі прычынамі. У гэты перяд завяршаўся працэс кансалідацыі тэрыторыі дзяржавы, цэнтральная ўлада набывала ўсё большую моц, прычым улада князя пачынае абмяжоўвацца не толькі радай, але і соймам дзяржавы. Саслоўе шляхты, станаўленне якога яскрава праследжваецца ў папярэдніх заканадаўчых актах, патрабуе павелічэння і заканадаўчага замацавання сваіх

правоў і прывілеяў. Аднак, у прэамбуле да Статута Вялікі князь ВКЛ і адначасова Кароль Польшчы Жыгімонт I аб’яўляе, што жадае даць правы на вечныя часы ўсім жыхарам дзяржавы: «подданым а тубылцом», свецкім і духоўным, праваслаўным і католікам, спасылаючыся пры гэтым, што яны мелі гэтыя правы ад папярэдніх Вялікіх князёў Казіміра, Аляксандра і іншых.

Галоўнае, што адрознівала Статут ад падобных заканадаўчых актаў іншых тагачасных дзяржаў, гэта ўласныя падставы кадыфікацыі і яго канстытуцыйная накіраванасць. Ён не ўзяў за аснову класічную рымскую сістэму права, а грунтаваўся на самастойна распрацаванай прававой сістэме, шмат у чым падобнай на сучасную галіновую. Першыя тры раздзелы Статута ўключалі ў асноўным канстытуцыйныя нормы, хаця такія сустракаюцца і ў іншых раздзелах. Закон рэгламентаваў асновы грамадска-палітычнага ладу дзяржавы, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых дзяржаўных і судовых органаў, прававое становішча розных катэгорый насельніцтва і шмат іншае.

Статут усталёўваў прынцып адзінства права для ўсіх жыхароў дзяржавы. Адзін з яго артыкулаў прама гаворыць:”иж вси подданые наши, так вбогие, яко и богатые, которого раду колве або стану были бы, ровно а одностайным тым писаным правом мають сужоны быти” (р. 1, арт. 9). Увядзенне ў Статут гэтай нормы-прынцыпа было вельмі важным, бо садзейнічала фарміраванню суверэнітэта нацыі, які забяспечвала кіраўніцтва ВКЛ шляхам пашырэння юрысдыкцыі на ўсю тэрыторыю дзяржавы. Аднолькавае ж дзеянне закона ў адносінах да ўсіх падданых садзейнічала рэлігійнай згодзе, фарміраванню і кансалідацыі нацыі.

У Статуце выразна праследжваецца ідэя падзела ўладаў, аб чым сведчыць шэраг нормаў. Так, Вялікі князь абавязваецца прымаць законы сумесна з панамі-радай, а ў некаторых выпадках патрабуецца “ухвала земская”, г.зн. скліканне сойма (напрыклад, пры вызначэнні колькасці прадстаўлення ратнікаў). Аднымі з важнейшых канстытуцыйных нормаў былі тыя, што абмяжоўвалі ўладу вялікага князя (гаспадара дзяржавы). Усе

справы ў дзяржаве ён павінен быў вырашаць "дзеля агульнай карысці" са згоды паноў радных. Адпаведна Статуту Вялікі князь з'яўляўся вышэйшай службовай асобай дзяржавы, якая павінна была падпарадкоўвацца дзяржаўным законам і пры рэалізацыі ўладных паўнамоцтваў дзейнічаць у межах статутных нормаў. Пры гэтым акцэнтавалася ўвага на тым, што ў выпадку набыцця вялікім князем права валодання яшчэ якой-небудзь дзяржавай, ён абавязваецца не прыносіць шкоды ВКЛ і панам радным (р.3, арт.1). Гаспадар павінен быў клапаціцца аб павелічэнні тэрыторыі ВКЛ, абавязваўся не памяншаць яе (р.3, арт.2), не даваць чужаземцам пасад і земляў у дзяржаве (р.3, арт.3). Такім чынам, закон дэкларуе прынцып дзяржаўнага суверэнітэту і вызначае абавязак манарха ўсялякімі сродкамі абараняць яго. У сувязі з тым, што ВКЛ знаходзілася ў стане уніі з Польшчай закон забараняе Вялікаму князю і адначасова Каралю Польшчы што-небудзь каму-небудзь дараваць на тэрыторыі Княства, знаходзячыся ў Польшчы (р.1, арт.25).

Статут абавязвае манарха захоўваць ранейшыя службовыя пасады ў дзяржаве, дазваляе службовым асобам дзейнічаць адпаведна старым звычаям, аднак выкарыстоўваючы пры гэтым статутныя нормы (р.3, арт.4). Закон дае права ўсім феадалам свабодна выязджаць за межы дзяржавы для пошука лепшага шчасця ці рыцарскіх учынкаў, выключаючы землі непрыяцельскія (.р.3, арт. 8). Вялікі князь пацвярджае дзеянне выдадзеных раней заканадаўчых актаў, а новыя абяцае прымаць з мэтай карысці для дзяржавы і толькі з дазвола паноў рады (р.3, арт.6), абяцае ўсіх феадалаў, а таксама мяшчан і іх людзей (!), захоўваць пры свабодах і вольнасцях, дадзеных ім асабіста і яго папярэднікамі (р.3, арт.7). Важным у сацыяльна-эканамічным аспекце быў таксама артыкул 9 трэцяга раздзела, у якім гаварылася аб праве не толькі феадалаў, але і мяшчан свабодна (г. зн. без дазволу манарха) наследаваць маёмасць сваіх бацькоў. Граматы ж на нерухомасць у дзяржаве павінны былі прымацца князем толькі разам з

панамі раднымі, знаходзячыся на вальным сойме, што сведчыла аб зараджэнні інстытута парламентарызму.

У сувязі з працэсам фарміравання прывілеяванага саслоўя шляхты і забеспячэннем оховы яе правоў Статут забараняе ўзвышать простых людзей над шляхтай, а шляхту абавязвае заўседы захоўваць «в их почтивости» (р.3, арт.10). У законе ўдакладняецца норма аб недатыкальнасці асобы. Вядома, перш за ўсё мелася на ўвазе шляхта, правы якой дастаткова поўна рэгламентаваліся ў трэцім раздзеле Статута. Даючы даволі шырокія правы асобам шляхецкага саслоўя, Статут адначасова рэгламентуе і іх абавязкі, аб чым гаворыцца у яго другім раздзеле, прычым закон удакладняе і развівае палажэнні, якія раней былі выкладзены ў агульназемскіх граматах аб вайсковай службе і інш. Так, напрыклад, у Статуце не проста рэгламентуецца, як у грамаце Ягайлы 1387 года, старажытная “пагоня”, а гаворыцца ўжо аб добра арганізаванай вайсковай службе з канкрэтызацыяй правоў і абавязкаў вайскова абавязанага насельніцтва, у тым ліку іх абавязковым пералікам, сістэматычнымі аглядамі войска і г.д. (р.2). Паводле Статута і спецыяльных вайсковых пастаноў, усе паўналетнія вайсковаабавязаныя асобы павінны пад час вайны выконваць вайсковую службу, прычым вялікі князь грозна прыказвае збірацца ўсім абавязаным пад павятовымі харугвамі (р.2, арт.1-2). Закон рэгламентуе пэўныя выключэнні з гэтага правіла (асаблівыя гетманскія прадпісанні і інш.), парадак з’яўлення ў дзеючую армію і іншыя аспекты выканання вайсковага абавязку.

Многія канстытуцыйныя палажэнні папярэдніх агульназемскіх грамат XV-XVI ст. у Статуце паўтараюцца, удакладняюцца і дапаўняюцца, прычым выразна бачна жаданне заканадаўцы ўстанавіць належны правапарадак ў дзяржаве. Гэта тычыцца палажэнняў аб адказнасці кожнага за сябе і свае правапарушэнні, аб абавязковым і неадкладным разглядзе тых судовых спраў, якія былі ўзбуджаны пры папярэдніх князях і інш. Пры гэтым Вялікі князь звяртае ўвагу на пераемнасць у жаданні ўсталявання законнасці і правапарадка. Ён пацвярджае законнасць падараванняў феадалам зямель

папярэднімі князямі, абяцае ў тэрмін разглядаць справы, якія тычацца гонару чалавека або яго добрай славе, вызваляе жыхароў дзяржавы ад шэрагу павіннасцей адпаведна звычаёваму праву і г.д. (р.1, арт.15, 19, 20-22 і інш.)

Нормы, якія прадугледжваюць забеспячэнне законнасці і правапарадку утрымліваюцца ў шматлікіх артыкулах Статута. Так, гаворыцца, што пастановы вялікага князя, прынятыя сумесна з радай, павінны выконвацца абавязкова, пад пагрозай крымінальнага пакарання (р.1, арт.23). У тым выпадку, калі князь выдаў пісьмовы дакумент адносна маёмасных правоў адной асобе, а потым на гэту ж маёмасць выдаў іншай асобе грамату, то лічыўся законным першы дакумент, акрамя выпадкаў не ўступлення ў валоданне маёмасцю на працягу дзесяці гадоў (р.1, арт.24). Службовыя асобы абавязваліся ў сваёй дзейнасці карыстацца законам. Суддзі павінны былі судзіць у межах закона, сумленна і справядліва. (р.6, арт.1). У выніку ўзнікнення юрыдычнага канфлікту закон абавязвае прымяняць толькі статутныя нормы. Адмова ў ажыццяўленні правасуддзя па прычыне адсутнасці адпаведнай статутнай нормы забаранялася і г.д.

Нормы Статута сведчаць аб дастатковай моцы і аўтарытэце судовай улады ў дзяржаве. Законам ахоўваўся аўтарытэт суда. Так, за праяўленне непавагі да суддзяў прадугледжавалася крымінальная адказнасць. Таксама і суддзі пры ажыццяўленні правасудддзя нікога не павінны былі абражаць і ганьбаваць. У зваротным выпадку яны неслі адказнасць за свае неправамерныя дзеянні. Закон забараняў судзіць і караць, у тым ліку адымаць пасады і землі, на падставе завочнага абвінавачвання. Гарантыямі справядлівасці судовых рашэнняў было права на абскарджанне судовых пастаноў, наяўнасць інстытута адвакатуры, а таксама замацаванне такіх важных прынцыпаў (якія мелі месца ў агульназемскіх граматах), як адказнасць кожнага за сваю віну, у адпаведнасці з законам і ў судовым парадку. Менавіта гэтыя палажэнні ўтрымлівалі ўжо элементы прэзумпцыі невінаватасці.

Адзначаючы важнасць і канстытуцыйную накіраванасць Статута, узнікае пытанне аб прычынах уключэння ў закон былі такіх важных прававых норм. На наш погляд, у першую чаргу таму, што ВКЛ, знаходзячыся ў дагаворных (унійных) адносінах з Польшчай, імкнулася захаваць сваю самастойнасць. Акрамя таго, заканадаўца жадаў усталяваць адзіную законнасць і правапарадак ў дзяржаве, якая стваралася доўгі час з шэрагу былых самастоўных дзяржаў–княстваў. Падаецца, што ўключыўшы канстытуцыйныя нормы, Статут меў галоўнай мэтай – умацаванне адзінства новай дзяржавы і яе незалежнасці.

Літаратура:

1. Pirmasis Lietuvos Statusas - Первый Литовский Статут. - Vilnifus. V.: Mintis, 1983. – S.12.

Тамсама. – S.13.

2. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Минск: Изд-во Академия наук БССР, 1960. - 254 с.

3. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: Вучэб.дапам. – Мінск: Універсітэтскае, 1992. - С.163.

4. Pirmasis Lietuvos Statusas - Первый Литовский Статут. - Vilnifus. V.: Mintis, 1983. – S.12.